и т.д. Мы разбили исследуемых на группы по 3 человека, выдали им нашу методическую разработку по точечному массажу, провели инструктаж по его применению. Работницы ЛАЦа и коммутаторного цеха наблюдались в динамике, проводилась психологическая работа по устранению негативного отношения к своему организму, нежелания серьезно заняться своим здоровьем (неоднократные беседы о самоценности здоровья и контроль проведения его коррекции). В результате у 67% обследованных объективно и субъективно обнаружено улучшение самочувствия, исчезли жалобы на головные боли, быструю утомляемость, слабость. У многих работниц снижено АД, исчезли боли в эпигастральной области, выравнились показатели электропунктурной диагностики (стали в пределах физиологического коридора). Все это говорит об улучшении функциональных систем организма.

В трудовых коллективах необходимо прежде всего нацеливать работающих на внимательное отношение к своему организму, давать профилактическое направление в коррекции улучшения многих звеньев его функциональных систем. Коррекцию следует проводить немедикаментозными методами воздействия на организм. При анализе анкетных данных обращает на себя внимание пункт "индивидуальная реализация стресса". Как правило, в 87% случаев мы не умеем правильно нейтрализовать стресс, что может явиться причиной развития психосоматических заболеваний, неврозов. Это очень важный рубеж, который необходимо преодолеть и разработать специальную систему индивидуальной подготовленности к нейтрализации стресса. Такая система разработана на РМТС лабораторией активизации и восстановления работоспособности. Нами также разработаны методические рекомендации по применению физических упражнений древней гимнастики Гермеса (она была апробирована в клинике), дающая положительные результаты воздействия на сердечно-сосудистую, центральную и вегетативную нервную системы.

Э.В.СадаунIчы
(кафедра лIтаратуры)

## ДУХОУНЫ ВОБЛІК БЕЛАРУСКАГА НАРОДА У П'ЕСЕ У.КАРАТКЕВІЧА "ЗВАНЫ ВІЦЕБСКА"

Беларуская драматургIя, пачынаючы з 60-х гадоу, калI у лIтаратуры канчаткова усталявауся новы погляд на чалавека, вельмI



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шмат зрабіла для адлюстравання і развіцця духоўнай культуры народа. Дастаткова прыгадаць лепшыя творы Макаёнка, Дзялендзіка, Матукоўскага, Петрашкевіча, Шабана і інш. З іх асабліва вылучаюцца гістарычныя п'есы Уладзіміра Караткевіча сваёй пільнай, зацікаўленай увагай да праблемы народа, яго гістарычных шляхоў і нацыянальнай адметнасці, да вытокаў непаўторна беларускіх асаблівасцей народнага характару.

Праз усе драматургічныя творы пісьменніка больш-менш значным лейтматывам праходзіць тэма барацьбы народа за сваё існаванне як беларускага, але ў "хроніцы з XVII стагоддзя" "Званы Віцебска" яна стаіць на пярэднім плане, з'яўляецца галоўнай тэмай твора. Адлюстроўваючы ў п'есе паўстанне 1623 года ў Віцебску, драматург у якасці асноўчай яго матывацыі падкрэслівае абурэнне віцьбічаў жорсткай палітыкай уніяцкага арцыбіскупа Полацкага і Віцебскага Іасафата Кунцэвіча, які, насаджаючы новае веравызнанне, зусім не лічыцца з векавечнымі духоўнымі традыцыямі народа, бязлітасна карае за непаслушэнства, за што атрымлівае ад людзей імя Ізахват.

Галоўны канфлікт, "адзінае дзеянне" п'есы "Званы Віцебска" і пралягае вось у гэтым рэчышчы усеагульнай народнай нянавісці, скіраванай на біскупа Іасафата Кунцэвіча, па паходжанні – беларуса, які здрадзіў бацькаўшчыне і якога паўстанцы без шкадавання забіваюць, за што гараджан люта караюць улады. Галоўныя сілы, якія ўдзельнічаюць у барацьбе, – з аднаго боку, віцьбічы, народ, з другога – Кунцэвіч і яго памагатыя Палікар Абрагімовіч, тысячнік, галава біскупскай "гвардыі", езуіт Станіслаў Касінскі, духоўнік Кунцэвіча, архідыякан Дарафей, даверадая асоба біскупа.

Малюючы жывы, бурлівы, адначасова цэласны і разнатвары вобраз народа, апантанага адным пачуццём, памкненнем, жаданнем, Караткевіч дыферэнцуе яго на шэраг персанажаў, якія раскрыты з рознай ступенню паўнаты, але ўсе – з выразна акрэсленай індывідуалізацыяй. Перш за ўсё з масы дзеючых асоб з народа трэба вылучыць галоўнага завадатара паўстання Сцяпана Пасіёру, сяброў Марцыяна Ропата, цэхавога, збраяроў-мечнікаў, і Антоні Вольху, залатых спраў майстра. У кожнага з іх свая пазіцыя, свае меркаванні наконт неабходнасці і тэрміну выступлення супраць біскупа. З іх найбольш непрымірымы і нецярплівы Марцыян Ропат. Ён за неадкладнае выступленне, ён гатовы ўласнаручна забіць Кунцэвіча, які для гараджан з'яўляецца ўвасабленнем зла, гвалту, разбою, што чыняць яго памагатыя.

Ропат адлюстроувае настрой большай часткI вIцьбIчау.

Сцяпан ПасIёра, якI у горадзе карыстаецца вялIзным аутарытэтам, чалавек абачлIвы I разумны, заклIкае не гарачыцца, крыху пачакаць, яшчэ раз перагаварыць з бIскупам, яшчэ раз папрасIць яго не ушчэмлIваць правоу гараджан, папрасIць мIру. Ён спадзяецца вырашыць урэшце рэшт справу мIрным шляхам, знайсцI, як зараз гавораца, нейкае кампрамIснае рашэнне, апошнIя сродкI – зброю – збIраецца ужыць толькI ужо у безвыходнай сIтуацыI, у крайнIм выпадку. Ад Iмя гараджан ПасIёра арганIзуе дэлегацыю да КунцэвIча, якая выстауляе бIскупу патрабаваннI ад горада спынIць уцIск I паважаць правы людзей ("трымаць нас пры правах нашых"), не пралIваць кроу тых, хто не хоча IсцI у адступнIцтва, не хоча ад мовы, веры, радзIмы адрачыся, не здекавацца з трупау продкау, прымушаючы выносIць Iх з горада для пахавання толькI праз тую браму, праз якую нечыстоту гарадскую вывозяць. Але пасланцы народа так I не прыйшлI да згоды з КунцэвIчам. ПасIёра папярэдзIу яго, што гэта была апошняя спроба мIрнага вырашэння пытання, што калI будзе парушаны спакой – хай ён тады крыудуе на сябе.

I калI такI момант настае (паслугачы бIскупа палягць царквушалеш "свавольнага" пана IлI), ПасIёра больш не вагаецца. Ён прызначае час народнага выступлення, пра якI павIнны абвясцIць званы гарадской ратушы.

У адрозненне ад Ропата I ПасIёры, АнтонI Вольха спачатку не верыць у праудзIвасць справы гараджан I лIчыць, што яго сябры дарэмна смуту заводзяць. Манутны, як волат, ён прагне мIру I спакою для людзей. Але людзI не прымаюць яго пазIцыю. Ропата не здавальняе гэткI "спакой магIлы". ПасIёра лIчыць, што у ваукоу накшталт КунцэвIча, якI адзIн замест усяго права, знаходзяцца у руках правы жыцця I смерцI як палякау, так I беларусау. Навум Воук адзначае, што вIцьбIчы мIрылIся з ганаровай уладай папы, але не могуць яны прымIрыцца з прынIжэннем чалавечай годнасцI. Неуспя I поп Iля удакладняюць, у чым жа заключаецца гэта прынIжэнне: у тым, што КунцэвIч Iх мовы пазбауляе, "як жывёл якIх", што быдлам беларускIх людзей завуць. Усе згодныя з высновай ПасIёры, што хаця у народа цярпенне першых хрысцIян, але ёсць мера I у гэтым цярпеннI, асаблIва калI "такIя асцярвяненнI вунII робяцца там, дзе людзе не звыклI да пакут I ярма", а вIцьбIчы да гэтага не звыклI.

ПазIцыя ВольхI у адносIнах да IдэI паустання у значнай ступе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нi абумоулена яго глыбокай чалавечнасцю, бо ён добра ведае, што вайна прынясе людзям шмат гора. Тонкасць, чуласць яго душы самым непасрэдным чынам злучана з характарам яго прафесII (ён залатых спраў майстра), якая вымагае творчага падыходу да сябе. Ён сапраудны мастак па натуры, што выяуляецца I у складаннI Iм вершау, песень, якIя спявае народ. Яму агIдная сама думка аб забойстве чалавека. КалI ужо становIцца для гараджан вIдавочнай неабходнасць забIць КунцэвIча I прымаецца рашэнне аб узброеным выступленнI,Волька у неуразуменнI, з унутранай нязгодай гаворыць: "За веру забIць чалавека? БыцI - як яны?"[I] На гэтае пытанне, звернутае да сябе I да Iншых, якое закранае самыя асновы маральнасцI чалавека, свавольны поп Iля адказвае: "Думаеш, толькI вера? Каб гэта, то яшчэ палова бяды... Не толькI вера. ПраудзIвей, не столькI вера. Справа на тое пайшла, цI быць, цI заставацца нам у векI вякоу - I давеку - тым, чым мы ёсць" (I08).

Па сутнасцI, Волька вымярае учынкI, паводзIны людзей па крытэрыях, як мы цяпер гаворым, агульначалавечых каштоунасцей, стаIць на пазIцыях так званага абстрактнага гуманIзму. Адсюль - I яго нежаданне удзельнIчаць у паустаннI, яго прапанова яшчэ раз звярнуцца да мIрскIх улад, напIсаць каралю. ВIцьбIчы, навучаныя горкIм вопытам МагIлёва, Полацка I Iншых гарадоу, не вераць у дзейснасць такога захаду. Але рэальнае жыццё на дае магчымасцI Вольку застацца убаку, узняцца над Iм, каб захаваць у недатыкальнасцI чысцIню свaёй душы. ПадзеI вымушаюць хлопца прыняць самы актыуны удзел у барацьбе, I нават больш таго - менавIта Волька забIвае КунцэвIча, каб не даць свайму названаму брату Ропату зрабIць злачынства - стаць бацьказабойцам, пра што напачатку не ведае I сам Ропат.

Вобразам ВолькI КараткевIч яскрава паказау хIсткасць пазIцыI абстрактнага гуманIзму. Жывая, канкрэтная рэчаIснасць нIколI не дае магчымасцI чалавеку адмахнуцца ад яе, абстрагавацца на справе у сферу высокIх "чыстых" маральных прынцыпау. Падобную пазIцыю вельмI выразна ацанIу яшчэ вялIкI Дантэ у "Боскай камедыI". Сам актыуны удзельнIк грамадскай барацьбы, ён добра бачыу бедствы, якIя яна нясе простаму народу, I карау яе удзельнIкау у сваёй апраметнай як "сейбIтау звадак". Тым не менш людзей, што ухIлялIся

---

I. КараткевIч УладзIмIр. Старыя беларускIя хронIкI. - Мн.,1988.- С.I08. (У далейшым спасылкI даюцца па гэтаму выданню у тэксце з указаннем у дужках старонкI).

ад барацьбы, здраджвалI сябрам, стаялI убаку, ён не пусцIу назад у пекла, пакIнуушы Iх тоупIшча ля уваходу: "Яны.не вартыя I слова: зIрнI - I мIма". КалI б Волька застауся убаку, ён здрадзIу бы сваIм сябрам, таварышам, суайчыннIкам, I тады сумленне не дазволIла б яму лIчыць сябе маральным чалавекам.

Грамадская пазIцыя, грамадска значныя учынкI як ВолькI, так I шэрагу Iншых персанажау п'есы (Ропат, ПалIкар, КунцэвIч) залежаць не толькI ад Iх светапогляду, але I цесна звязаны с Iх асабIстымI, прыватнымI пачуццямI, жаданнямI, памкненнямI. Такое натуральнае спалучэнне агульнага I асабIстага, аб'ектыунага I суб'ектыунага надае вобразам дзеючых асоб жыццёвую цеплыню I паунату. Напрыклад, грамадская дзейнасць I паводзIны ВолькI, Ропата, ПалIкара АбрагIмовIча самым непасрэдным чынам залежаць I ад таго, што усе яны кахаюць адну дзяучыну Багусю, а гэта накладвае на Iх узаемаадносIны свой адбIтак I выяуляецца у характары, мэтах Iх паводзIн.

Багуся кахала I хацела злучыць свой лёс з Волькам, пасяброуску любIла Ропата як блIзкага чалавека свайго абраннIка I ненавIдзела ПалIкара АбрагIмовIча, вернага слугI КунцэвIча I гвалтаунIка. Ропат рэунавау дзяучыну да ВолькI, часам злавауся на сябра, а паколькI быу адзIнокI, то гэтыя абставIны яшчэ больш умацоувалI яго у думцы самаахвярнага служэння народу, гораду. МенавIта каханне да дзяучыны, жаданне ёй шчасця з Волькам прымусIла яго узяць на сябе вIну за забойства КунцэвIча, калI ён даведауся ад ПалIкара, што Iх павялI катаваць агнём. Перад смерцю, развIтваючыся з людзьмI, Ропат упэунены у тым, што "нIякIм розумам, нIякIм гвалтам нельга дасягнуць таго, каб у ВIцебску не было ВIцебска, каб на нашай зямлI не было нашай зямлI" (126). Сваёй смерцю ён I пацвердзIу сваю пераканананасць у тым, што ворагам не заглушыць ВIцебскага набата, званоу роднай зямлI.

ТрагIчны лёс I ВолькI таксама у немалой ступенI прадвызначыла яго каханне да дзяучыны. Нежаданне напачатку удзельнIчаць у вайне тлумачылася I яго шчаслIвым узаемным каханнем з Багусяй: "Не трэба мне нIчога. НI зямлI, нI горада, нI веры, што нам толькI псуе, нI крумкача Iзахвата. НIчога. Абы толькI ты" (104). Ён марыць аб уласнай хаце з залатой сасны, складзенай яго моцнымI рукамI, у якой цёпла будзе ад печкI I ад прысутнасцI, пра тое, што у Iх будзе шмат дзяцей - I усе майстры I добрыя людзI. Пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэтае - пра радасць жыцця з любым - марыць І Багуся. Але у адрозненне ад Вольхі яна добра усведамляе, што не удасца схавацца ад жорсткай рэчаіснасці ні за якімі сценамі уласнай хаты, што нічога не будзе, "пакуль горад наш - як авечка сярод ваукоу, а пастухі далёка. Хату - адбяруць, у студню - наплююць, храм - чужынцы загадзяць. Дзяцей - за чужую зямлю біцца пагоняць. На мяне які-небудзь Палікар вокам кіне"(105). Прымаючы самы актыуны удзел у паустанні, Вольха бярэцца за доубню перш за усё для таго, каб абараніць Багусю ад здзеку і крыуды - не толькі з-за болю за свой горад і свой народ. Пасля разгрому паустання, калі у яго была магчымасць усё-такі застацца жывым і пабудаваць сваё шчасце з дзяучынай, уласныя мэты адступаюць у яго на задні план, здавалася б, насуперак здароваму жыццёваму сэнсу, і ён гіне, праяуляючы вышэйшую чалавечнасць і высакародства, а з ім разам ідзе добраахвотна на смерць і Багуся, бо гэта яна сама падштурхнула любага падняць руку на лютага ворага Кунцэвіча. Сваім жыццём і смерцю яна яскрава даказала тое, што сцвярджала біскупу, адмауляючыся ад яго прапановы выйсці замуж за багатага гараджаніна: "Усе нашы дзеукі - самі сабе гаспадыні. Тут вам не іншыя мясціны, дзе па церамах сядзяць і прадыхнуць не смеюць, дзе жанчыны - "сасуд скудзельны"(112).

На лёсе маладых віцьбічау самым непасрэдным чынам адбілася і каханне Палікара да прыгажуні Багусі. Свае заляцанні ён пачау з таго, што разам з прыхільнікам Кунцэвіча войтам Віцебска Мікалаем Завішам абрабавау гандлёвы караван лайбау з грузам, якія належалі бацьку дзяучыны, і увёу сям'ю у разор, а дзяучыну - у сіроцтва, а пасля пачау прапаноуваць ёй сябе як заступніка і дабрадзея, абы толькі выйшла за яго. Памылкова бачачы увесь час у Ропаце галоунага свайго суперніка, ён падманам адпрауляе нявіннага чалавека на плаху. Выкрыты перад людзьмі і акружаны усеагульнай пагардай, ён моліць Багусю, як апошні свой ратунак, не адштурхнуць яго, ён гатовы адкласці пакаранне, выратаваць Вольху. Калі ж яна у адказ плюе яму у вочы і далучаецца да любага, каб падзяліць яго лёс, Палікар, узлюшаны ад злосці, загадвае прывязаць іх да слупоу і замураваць у цэмент, ператварыць іх у нямых, мёртвых балванау на пострах усім. Адчуваючы, што яму нікога не удалося застрашыць, у лютасці сваёй і жаху перад людзьмі ён становіцца зар'ятам. Апошняя умоуная рамантыка - сімвалічная сцэна п'есы, калі гнеуны стук сэрцау людзей гучыць нясціхлым, незаглушаным,

непераможным набатам, набывае трывалую рэалістычную аснову таму, што аутар малює яе нібыта праз апантанае жудасным страхам уяулення Палікара, свядомасць якога не вытравала цяжару уласных злачынстваў і людской нянавісці. Суб'ектыуныя якасці характарау персанажау п'есы не супрацьпастауляюцца, а арганічна спалучаюцца і грунтоуна узмацняюць, падкрэсліваюць, яскрава выяуляюць асноуныя супярэчнасці і заканамернасці агульнай плыні жыцця, якое Караткевіч паказвае у творы.

З дзеючых асоб п'есы, якія надаюць непаУторныя, адметныя рысы вобліку народа, можна вылучыць, акрамя вышэйразгледжаных, "свавольнага" папа Ілю, не столькі актыунага змагара за веру, колькі за захаванне нацыянальнай адметнасці беларускага народа, бабу Абдзярыху, гандлярку калдунамі, Прузыну Трапашказу. "мамку" (выхавацельку) Багусі, дзяучатак Зулісю і Вальгіну, старую Еугу Бабук, былую павітуху, напоуюродку. Трэба адзначыць, што у дзеянні твора, у выяуленні народнага абурэння здекамі і гвалтам, вобразы жанчын іграюць важную ролю, бо гэтыя здекі і гвалт скіраваны у першую чаргу супраць іх. Яны значна узмацняюць эмацыянальны і нацыянальны каларыт твора.

Зусім асабліваe месца у сістэме мастацкіх вобразау п'есы займае вобраз напоуюродкі Еугі. Яна сваімі незразумелымі, на першы погляд, і страшнымі выказваннямі прыуносіць у твор раматычную загадкавасць, напружанасць, трагічныя прадчуванні. У самым пачатку п'есы Еуга прарочa апісвае карціну горада пасля падаулення паустання і пакарання гараджан. Мастацкую функцыю яе вобраза у п'есе можна параунаць з функцыяй вобраза прарочыцы Касандры у антычных грэчаскіх міфах, які выкарыстау, напрыклад, Эсхіл у трагедыі "Агамемнан" з трылогіі "Арэстэя" для стварэння трагічнага характару дзеяння твора. Акрамя гэтага сваімі загадкавымі выказваннямі пра біскупа Кунцэвіча, якога яна ведала з маладосці, Еуга надае яго вобразу арэол "рамантычнага злачынцы", малюючы яго бесчалавечныя учынкі з дапамогай фальклорных сродкау уз'эсла-гіпербалізаваных вусна-народных паэтычных метафар. Фальклорна-рамантычнае аздабленне выразна падкрэслівае кантраст паміж "чорнай", варожай чалавеку і яго шчасцю душой уніяцкага біскупа і "светлай" шчырай душой людзей з народа, дадае да рэалістычнай у сваей аснове характарыстыкі Кунцэвіча яркія ацэначна-эмацыянальныя фарбы.

Уніяцкі біскуп выступае у п'есе у якасці галоунага антага-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нIста народа. Ставячы перад сабой у сутнасцI сваёй гуманIстычную мэту - дасягнуць адзIнства людзей, ён Iмкнецца ажыццявIць яе крывавымI, бесчалавечнымI метадамI. Згубныя вынIкI такой палIтыкI для дзяржавы, народа I самой справы пранIклIва раскрывае у сваIм лIсце да бIскупа канцлер ВялIкага княства Леу Сапега, да якога звярнууся з просьбай аб дапамозе КунцэвIч I якому у рэшце рэшт давялося "у дзяржауных интарэсах" падауляць смуту вIцьбIчау, бязлIтасна караць паустанцау I горад (ВIцебск быу пазбаулены званоу - адзнакI вольнасцI, Майдэборскага права I усIх прывIлей). Канцлер, якI сам клапацIуся аб унII, быу незвычайна здзIулены тым, што яго прывялебнасць бIскуп выращну прыводзIць да яе людзей гвалтоуными сродкамI. Леу Сапега прадбачлIва папярэджвае КунцэвIча, што такое "бяспуцтва" узбуджае смуты, якIя могуць "патрэсцI" дзяржаву, I што тады будзе з унIяй? Канцлер заклIкае яго да цярпIмасцI, бо сам Хрыстос малIуся за ворагау.

Гэты лIст выклIкае у бIскупа нястрымную злосць: "Я не Хрыстос! - каментуючы вытрымкI з лIста, крычыць ён, - Я - меч, я - воук ягоны! I за свайго Хрыста я кроу пIць буду, мяса рваць"(98).

Разам з такой неразумнай жорсткасцю да ворагау, як яму здаецца, яго справы КунцэвIч выяуляе I глыбокае разуменне сутнасцI культуры. Ён, напрыклад, забараняе ПалIкару забIваць Вольху таму, што той "паэта": "Можа, другI на БеларусI пасля вялIкага МIколы з Гусава... Адна справа - узняць руку нават на знатнага. ТакIх хоць I заутра наробяць... А такIх , як ён, стагоддзямI трэба чакаць"(99). Гэта выказванне бIскупа, як I яго пэуная незадаволенасць сабой, пастаянныя думкI пра смерць, неспакойнае сумленне выяуляюць не толькI супярэчлIвасць яго характару I вобраза, але сведчаць I пра тое, што ён не зусIм адарвауся ад роднае глебы. Неусвядомленае адчуванне КунцэвIчам драматызму, нават трагIзму свайго лёсу падкрэслIваецца матывам "згубленага I знойдзенага сына" (пра тое, што сын КунцэвIча жывы I хто ён, паведамляе бIскупу Еуга). Яго сын Ропат разам з вIцьбIчамI аказваецца яго ворагам. Каб знайсцI шлях да сэрца роднага сына, трэба знайсцI шлях да роднага народа, якому ён стау дауно чужым I варожым. Усё гэта прымушае КунцэвIча задумацца, перагледзець сваё жыццё, усумнIцца у правасце сваёй дзейнасцI. Але ужо позна. Занадта позна ён даведваецца, што духоунIк езуIт СтанIслау КасIнскI меу на мэце здзейснIць свае Iнтарэсы. КараткевIч тлумачыць жорсткасць I бесчалавечнасць Кунцэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вIча памылковым яго уяуленнем, у якое яго увялI унIяты, дакладней, IезуIты: "А няужо ты думаеш, што мы увесь час рыхтавалI цябе да нечага Iншага, чым пакутнIцтва, пакутнIцкая смерць?...Увесь твой шлях - гэта не ты, вялIкI дзеяч веры, вялIкая асоба гIсторыI. Думаеш, гэта ты задзIрау гэты народ? Гэта мы - тваIмI рукамI I тваIм языком, тваIмI учынкамI, тваIмI думкамI, добрымI I благIмI. РабIлI мы. Але адказваць будзеш ты"(II4).

Вядома, што кожны пIсьменнIк, пра што б ён нI пIсау - пра дауняе мIнулае цI пра далёкую будучыню - заусёды засяроджвае сваю увагу на тых праблемах, якIя хвалююць сучаснIкау I яго самога. Вобразам унIяцкага бIскупа КунцэвIча, якI паклау сваё жыццё для дасягнення вялIкай мэты адзIнства людзей праз прынIжэнне чалавека I яго годнасцI I замест любвI да сябе заслужыу усеагульную нянавIсць, пагарду, гнеу, абурэнне, што пахавала яго самога, УладзIмIр КараткевIч выкрыу задоуга да перабудовы сутнасныя працэсы нашай рэчаIснасцI апошнIх дзесяцIгоддзяу. Таму п'еса "Званы ВIцебска" вельмI суз'гучная цяперашняму часу. А яшчэ больш яна злабадзённая таму,што усёй сIстэмай мастацкIх вобразау, Iдэйным пафасам яна па-новаму, па-сучаснаму асвятляе цяперашнюю барацьбу за адраджэнне беларускай нацыянальнай духоунай культуры узорным прыкладам з гераIчнай гIсторыI нашага народа I заклIкае да мужнасцI I самаадданасцI у крапатлIвай, штодзённай працы на гэтай высакароднай нIве, каб мы былI, як сказау "свавольны", паводле КараткевIча, поп Iля, "у векI вякоу - давеку - тым, чым мы ёсць" - беларусамI.

А.А.Балай
(кафедра физвоспитания)

## НОВЫЙ ПОДХОД К ЗАЧЕТУ ПО ФИЗИЧЕСКОМУ ВОСПИТАНИЮ

Существующие зачетные требования по физическому воспитанию довольно сложны. Чтобы выставить студенту зачет, необходимо учесть его успехи в шести показателях. Это - посещаемость занятий, знание теоретического раздела программы, усвоение методических навыков по использованию средств физической культуры, овладение техникой изучаемых физических упражнений, самостоятельное выполнение рекомендуемого минимального объема физических упражнений и, наконец,- выполнение контрольных нормативов по общей и профессиональ-